УДК 94(474.5+438)

Мікалаева Людміла Віктараўна, Liudmila Mikalayeva
Кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін,
PhD in History, Associate Professor, Head of the Department of Humanities,
Mikalayeva@bsuir.by, +375-29-620-28-47.
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», г. Минск, Республика Беларусь,
Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics, Minsk, Republic of Belarus.

# Аналіз Крэўскага акта ў гістарычных працах польскіх даследчыкаў XIX – 30-х гг. XX ст.

# Analysis of the Act of Krevo in the historical works of Polish researchers XIX − 30s of the XX century

*Анатацыя*. У артыкуле прадстаўлены комплексны аналіз вывучэння ў польскай гістарыяграфіі XIX – 30-х гг. XX ст. Крэўскага акта 1385 г. Адзначана, што доўгі час у польскай гістарычнай літаратуры гэты акт альбо абыходзілі, альбо пра яго пісалі вельмі мала. Сітуацыя змянілася толькі ў канцы XIX ст., калі была сфармулявана «тэорыя інкарпарацыі» зямель Вялікага Княства Літоўскага ў Карону Каралеўства Польскага. Тэзіс аб страце Вялікім Княствам Літоўскім дзяржаўнасці пасля Крэўскай уніі быў аспрэчаны ў 1930-х гг. Зроблена выснова, што Крэўскі акт быў прадметам увагі многіх польскіх гісторыкаў, якія так і не вычарпалі ўсіх пытанняў і стварылі базу для даследаванняў наступных пакаленняў даследчыкаў.

The article presents a the complex analysis of the study in the Polish historiography of the XIXth–30s. of the XX century of the 1385 Act of Krevo. It is noted that for a long time in Polish historical literature this act was either got around or very little was written about it. The situation changed only at the end of the XIXth century, when the «theory of incorporation» of the lands of the Grand Duchy of Lithuania into the Crown of the Kingdom of Poland was formulated. The thesis that the Grand Duchy of

Lithuania lost its statehood after the Union of Krevo was disputed only in the 1930s. It was concluded that the Act of Krevo was the subject of attention of many Polish historians, who did not exhaust all the questions and created a base for the research of the next generations of researchers
*Ключавыя словы:* гістарыяграфія; Вялікае Княства Літоўскае; Каралеўства Польскае; Крэўскі акт; літоўска-польскія ўзаемаадносіны.
Historiography; the Grand Duchy of Lithuania; Kingdom of Poland; the Act of Krevo; Lithuanian-Polish relations

Злучэнне Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ), пачатак чаму быў пакладзены ў 1385 г. Крэўскім актам і абраннем вялікага князя літоўскага Ягайлы на польскі трон у 1386 г., рашаючым чынам паўплавала на ход далейшай гісторыі гэтых дзяржаў, а таксама рэгіёна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы цалкам. Гэты саюз адчыняў Польшчы шлях да новай сферы інтарэсаў на Усходзе. ВКЛ ён дазваляў пачаць працэсы вестэрнізацыі ва ўнутраным жыцці дзяржавы і грамадства. Шматвекавы саюз абедзвюх дзяржаў быў распачаты трымя падзеямі, які мелі фундаментальнае значэнне для яго існавання. Гэта былі: выданне Ягайлам Крэўскага акта (14 жніўня 1385 г.), яго каранацыя польскім каралём (4 сакавіка 1386 г.) і выезд у Літву ў пачатку 1387 г. з мэтай удзелу ў хрышчэнні літоўцаў-язычнікаў.

Сярэднявечная гісторыя саюза Каралеўства Польскага і ВКЛ была прадметам вывучэння многіх знакамітых польскіх гісторыкаў. Вынікам іх працы сталі выдатныя творы і менш значныя даследаванні. Польская гістарыяграфія XIX – першай трэці XX ст. утрымлівала вялікую колькасць прац, прысвечаных гісторыі Польшчы і яе саюза з ВКЛ на пачатковай яго стадыі. Было б бессэнсоўным пералічваць і абмяркоўваць усе даследаванні па гэтай тэматыцы. Таму паспрабуем прааналізаваць у першую чаргу тыя творы, якія фарміравалі гістарыяграфічную традыцыю і вызначылі пэўныя тэндэнцыі літуаністычных польскамоўных даследаванняў у тую эпоху.

У польскай гістарычнай літаратуры значэнне Крэўскага акта апісвалася і ацэньвалася па-познаму. Доўгі час гэты акт альбо абыходзілі, альбо пра яго

пісалі вельмі мала. Крэўскага акта не ведаў Войцех Каяловіч, які жыў у XVII ст. і ў сваёй «Historia Lituaniae» апісваў пасольства Ягайлы на чале са Скіргайлам у Кракаў у 1385 г. У працы гісторыка быў адлюстраваны змест пасольства, у прыватнасці абяцанні, якія Ягайла абавязваўся выканаць пасля заключэння шлюбу з польскай каралевай Ядвігай. У іх ліку было і абавязацельства аб тым, што «…Magnum Litvaniae Principatum, cum universis Litvani juris provinciis, Reipublicae Poloniae aeterno foedere conjuncturum…» (Вялікае Княства Літоўскае з усімі правінцыямі літоўскага права будзе аб'яднана вечным дагаворам з Польскай Рэччу Паспалітай) [1, p. 383].

Адам Нарушэвіч, які пісаў у эпоху Асветніцтва, у сваёй «Historii narodu polskiego» ўзгадваў сустрэчу Ягайлы з польскім пасольствам у Крэве, на якой вялікі князь літоўскі пацвердзіў абяцанні, што былі дадзеныя раней пасольствам Скіргайлы. Таксама ён апублікаваў у спасылцы тэкст ратыфікацыйнага дакумента, які меў тую ж дату, што і дагавор у Крэве [2, s. 284]. Аднак гэты дакумент істотна адрозніваўся ад вядомага нам Крэўскага акта, бо быў больш кароткім і не ўключаў зместу прынесеных абяцанняў, толькі іх агульнае пацвярджэнне. Падрабязны пералік абяцанняў Ягайлы А. Нарушэвіч выклаў, апісваючы прыём паслоў вялікага князя літоўскага ў 1385 г. пры каралеўскім двары ў Кракаве [2, s. 280]. У іх ліку было абяцанне злучэння з Польскай Каронай ВКЛ і рускіх зямель [2, s. 282]. На думку А. Нарушэвіча, выкананне гэтага абавязацельства адбылося непасрэдна пасля каранацыі Ягайлы польскім каралём у форме ўрачыстай прысягі, якая ўтрымлівала пацвярджэнне уніі дзвюх дзяржаў [2, s. 296].

Ігнат Даніловіч, які быў прафесарам Віленскага ўніверсітэта ў 1820-я гг. у першым томе «Skarbca dyplomatów...» пісаў пра пачаткі уніі: «Больш шчаслівы, чым Вільгельм, супернік прымае хрышчэнне пад іменем Уладзіслава, клянецца на вечныя часы ўключыць у Карону Літву, Жамойць і падпарадкаваныя сваёй уладзе рускія княствы. Пасля каранацыі адбываецца вяселле…» [3, s. 259]. У І. Даніловіча не было нават згадкі пра Крэўскае пагадненне. Затое гаворка ішла пра сустрэчу і дагавор у Ваўкавыску ў пачатку студзеня 1386 г. [3, s. 257].

Іаахім Лелявель успрымаў польска-літоўскую унію як праяву свободы польскага і літоўскага народаў, якія, дзякуючы ёй, імкнуліся да поўнага аб’яднання. У «Dziejach Litwy i Rusi aż do unii z Polską w Liublinie 1569 zawartej» даследчык нічога не пісаў пра Крэўскі акт, бо для І. Лелявеля ключавым элементам у працэсе аб’яднання Польшчы і ВКЛ стаў шлюб Ягайлы з Ядвігай. Таму таксама, па перакананні даследчыка, саюз паміж дзвюмя дзяржавамі быў заключаны не ў Крэве, а ў момант заключэння шлюбу Ягайлы з Ядзвігай. Гісторык пісаў: «…здавалася, што дынастычная ідэя злучае дзве дзяржавы» [4, s. 158]. Гісторык толькі ўзгадаў пра прыезд у Кракаў паслоў Ягайлы і прынесенае абяцанне хрысціць Літву, а таксама далучыць да Польскага каралеўства ВКЛ [4, s. 149]. У іншым месцы І. Лелявель нагадаў пра рашэнне Ягайлы ўключыць Літву і Русь у Польшчу, на што спатрэбілася «…амаль два стагоддзі, шэсць пакаленняў, перш, чым яно ўступіла ў сілу» [4, s. 154]. У цэлым, атаясамліванне інтарэсаў народа з інтарэсамі пануючай эліты выклікала скажэнне бачання польска-літоўскай уніі ва ўяўленні даследчыка. У выніку І. Лелявель стварыў яе ідэалізаваны вобраз, услаўляючы добраахвотны саюз Польшчы з ВКЛ і гістарычную місію Польшчы на ўсходзе.

Больш падрабязную інфармацыю пра Крэўскі акт прадставіў толькі Юзаф Шуйскі ў першым томе працы «Dzieje Polski podług ostatnich badań», якую выдаў у Львове ў 1862 г. Ён пісаў, што ў Крэве на сустрэчы з польскімі і венгерскімі пасламі 14 жніўня 1385 г. Ягайла выдаў дакумент, які пацвярджаў яго абяцанні, прынесеныя раней вялікакняжацкімі пасламі ў Кракаве. Сярод іх фігуравала і абавязацельства, што Ягайла «…Літву з Польшчай назаўсёды злучыць» [5, s. 287].

Іншы вядучы прадстаўнік кракаўскай гістарыяграфічнай школы Міхал Бобжыньскі, прафесар гісторыі польскага права на юрыдычным факультэце Ягелонскага ўніверсітэта, аб уніі ў Крэве толькі коратка ўпамянуў у сваёй знакамітай працы «Dzieje Polski w zarysie». Гісторык пісаў, што пасля атрымання адказу польскага боку на сваё пасольства Ягайла «…14 жніўня 1385 г. разам з астатнімі літоўскімі князямі выдаў у Крэве ўрачысты прывілей, у

адпаведнасці з якім абавязаўся прыняць хрысціянскую веру са сваім народам, злучыць Літву з Польшчай і змагацца за вяртанне страчаных Польшчай зямель» [6, s. 203].

Падрабязным аналізам Крэўскай уніі, яе прычын і наступстваў заняўся толькі Анатоль Лявіцкі, выкладчык Кракаўскага ўніверсітэта. А. Лявіцкі ў некалькіх сваіх працах быў першым, хто прапанаваў тэзіс тое, што акт у Крэве прывёў да інкарпарацыі, г. зн. уключэння ВКЛ у Польшчу [7, s. 133]. На думку даследчыка, лацінскі дзеяслоў «applicare» з Крэўскага акта быў тоесны дзеяслову «incorporare». Інкарпарацыя пацягнула за сабой знікненне дзяржаўнасці ВКЛ, якое стала польскай правінцыяй. Крэўскі акт 1385 г. быў пачаткам ажыццяўлення вялікага палітычнага плана, які стаў па сутнасці цывілізацыйнай місіяй, што заключалася ў палітычнай заваёве Польшчай зямель ВКЛ, а таксама ў распаўсюджванні на іх каталіцызму шляхам ажыццяўлення місіі хрысціянізацыі літоўцаў-язычнікаў і вяртання праваслаўных русінаў да уніі з каталіцкім касцёлам. Гэты план знайшоў падтрымку вялікага князя літоўскага Ягайлы, якому ў замен за землі ВКЛ і згоду адмовіцца ад язычніцтва быў прапанаваны каралеўскі трон у Кракаве. У пацвярджэнне гэтай пазіцыі А. Лявіцкі згадаў два дакументы Ягайлы ад 20 лютага 1387 г., у якіх літоўская шляхта і землі ВКЛ названыя як «той жа Кароне падпарадкаваныя» [7, s. 130–133]. Па словах А. Лявіцкага, польска-літоўская унія была рэалізацыяй плана стварэння адзінай дзяржавы ў складзе Польшчы, Літвы і Русі з адзінай прававой, грамадскай і рэлігійнай (каталіцкай) сістэмай. Гэта быў план самога Ягайлы ў ВКЛ і «мудрага пакалення польскіх магнатаў, якія тады разам з Ягайлам кіравалі дзяржавай» [8, s. 245]. Пачатак гэтай вялікай задуме паклаў сам польскі кароль Казімір Вялікі, які ініцыяваў экспансію Польскага Каралеўства на землі Чырвонай Русі. А. Лявіцкі, услед за Антоніем Прахаскай, сцвярджаў, што менавіта «…у школе Казіміра Вялікага трэба шукаць стваральнікаў і аўтараў уніі» [8, s. 252].

Меркаванне А. Лявіцкага паклала пачатак т. зв. «тэорыі інкарпарацыі», у аснову якой быў пакладзены згаданы тэзіс пра ўключэнне ў выніку уніі ў Крэве

зямель ВКЛ у Карону Каралеўства Польскага. Прыхільнікамі дадзенай тэорыі былі такія выдатныя гісторыкі адроджанай Польшчы, як Освальд Бальцэр, Станіслаў Кутшэба, Ян Адамус.

Гісторык права О. Бальцэр у працы «Tradycja dziejowa unii polsko-litewskiej» пісаў: «Прававыя і дзяржаўныя адносіны Літвы з Польшчай, пачынаючы з 1386 г., не адразу набылі пастаянна вызначаны выгляд; яны вытрывалі некалькі розных эвалюцыйных стадый, сярод якіх самыя іх сутнасць і змест падвяргаліся прынцыповым зменам. […] Спачатку ў выніку дагавораў 1385–1386 гг. Літва была ў поўным значэнні гэтага слова ўключана, ці інкарпаравана ў Польшчу. Яна страціла сваю ранейшую правасуб'ектнасць, стала зямлёй, ці групай зямель, якія ператварыліся ў звычайныя правінцыі польскай дзяржавы» [9, s. 6]. Толькі ў наступныя гады ў выніку супраціўлення палітычнай эліты ВКЛ адбыўся адыход ад гэтай канцэпцыі на карысць вяртання да дзяржаўнасці ВКЛ з тым, што гэта дзяржава пад кіраўніцтвам вялікага князя літоўскага Вітаўта павінна была падпарадкоўвацца Польшчы, ці Кароне. Гэта ўсё яшчэ была інкарпарацыя, хаця і ў змененай форме. Згодна з меркаваннем О. Бальцэра, «дзяржаўная суб'ектнасць Літвы ўяўлялася як пераходнае становішча» [9, s. 8], якое з часоў Гарадзельскай уніі ператварылася ў становішча сталае [9, s. 9]. Гэту праблему О. Бальцэр закранаў таксама ў іншых працах, як, напрыклад, «Unia horodelska» [10], «Stosunek Litwy do Polski» [11, s. 252–265]. Належыць звярнуць увагу на палітычны аспект разважанняў О. Бальцэра ў сувязі з польска-літоўскімі спрэчкамі пасля Першай сусветнай вайны. Гэты аўтар не хаваў палітычнага значэння сваіх заяў, якія павінны былі ўскосна апраўдваць польскія прэтэнзіі на землі былога ВКЛ.

Таксама кракаўскі гісторык права С. Кутшэба, выбітны даследчык палітычнай сістэмы старой Польшчы, сцвярджаў, што наступствам дагавора ў Крэве быў шлюб Ягайлы з каралевай Ядвігай, яго абранне, а затым каранацыя польскім каралём, а таксама далучэнне зямель ВКЛ да Польшчы ў якасці складовай часткі апошняй. Тэрмін «applicare», які фігураваў у Крэўскім акце, на думку С. Кутшэбы, не быў юрыдычным тэрмінам; правільнай тэхнічнай

дэфініцыяй для абазначэння зместу абавязацельства Ягайлы быў тэрмін «incorporare» [12, s. 457]. Гэта было «ўмоўнае абавязацельства, прынятае Ягайлам у выпадку, калі ён будзе абраны каралём Польшчы» [13, s. 166]. Такім чынам, дагавор у Крэве не быў уніяй, якая, па меркаванні С. Кутшэбы, патрабавала выкананне прынцыпу роўнасці суб'ектаў. Гэта была інкарпарацыя з захаваннем у ВКЛ уласнага права і асобных інстытутаў [12, s. 478–481]. Падобны пункт гледжання быў прадстаўлены С. Кутшэбай у наступных выданнях першага тома «Historji ustroju Polski w zarysie» [14, s. 119].

У сваю чаргу О. Халецкі лічыў, што ў перыяд 1386–1401 гг. ВКЛ страціла статус самастойнай дзяржавы ў выніку ўключэння яго ў Польшчу. У выніку намаганняў палітычнай эліты ВКЛ яго дзяржаўнасць была адноўлена ў 1401 г., калі паміж Уладзіславам II Ягайлам і князем Вітаўтам Кейстутавічам было падпісана т. зв. Віленска-Радамскае пагадненне [15].

Меркаванне пра інкарпарацыю ВКЛ у польскую дзяржаву таксама падзяляў гісторык Людвік Калянкоўскі, аўтар «Dziejów Wielkiego księstwa Litewskiego za Jagiellonów». Ён сцвярджаў, што становішча інкарпарацыі працягнулася аж да 1440 г., калі Паны рады ВКЛ прызналі каралевіча Казіміра Ягайлавіча вялікім князем літоўскім [16, s. 34]. Гэты акт быў раўназначны адраджэнню дзяржаўнасці ВКЛ.

Згаданыя даследчыкі выступілі таксама на VI Усеагульным з'ездзе польскіх гісторыкаў у Вільні ў 1935 г., па сутнасці падтрымаўшы раней выказаныя меркаванні [17; 18]. І хаця на гэтым з'ездзе дамініравалі галасы прыхільнікаў тэорыі інкарпарацыі, належыць адзначыць асобае меркаванне Я. Адамуса, маладога тады гісторыка права з Універсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні [19].

У наступныя гады міжваеннага парыяду праблема уніі ў Крэве працягвала выклікаць зацікаўленасць польскай гістарыяграфіі. З'явіліся даследчыкі, якія паставілі пад сумненне тэзіс аб страце ВКЛ дзяржаўнасці, адмаўляючы, ці аслабляючы пункт гледжання на яго непасрэдную інкарпарацыю ў склад Каралеўства Польскага. У прыватнасці, названы вышэй Я. Адамус,

спасылаючыся на меркаванне Адама Ветуляні аб сярэднявечнай інкарпарацыі [20, s. 35–38], адрозніваў інкарпарацыю sensu stricte (у строгім сэнсе), якая мела на ўвазе непасрэдную інкарпарацыю, ці ўключэнне тэрыторыі інкарпараванай дзяржавы ў склад тэрыторыі дзяржавы інкарпаруючай, ад інкарпарацыі ў шырокім сэнсе, якая заключалася ва ўсталяванні ленных адносін паміж адной і другой дзяржавамі. У апошнім выпадку інкарпараваная дзяржава, трапляючы ў ленную залежнасць ад інкарпаруючай дзяржавы, працягвала функцыянаваць як асобная дзяржава [21]. Па меркаванні Я. Адамуса, наступствам акта ў Крэве быў «намер інкарпарацыі» (гаворка ішла пра прамую, ці поўную інкарпарацыю), які на самой справе рэлізаваны не быў [21, s. 47]. Я. Адамус сцвярджаў, што выраз «applicare Coronae Regni», які быў ужыты ў гэтым акце, азначаў ні што іншае, як «аддаць дадзеную зямлю ў лен гэтай кароны» [22, s. 289]. Спачатку ў 1398 г., а канчаткова з Віленска-Радамскага пагаднення ў 1401 г. ВКЛ было інкарпаравана ў Польшчу выключна ў сэнсе ўваходжання з ёй у ленныя адносіны [21, s. 76].

Супраць меркавання Я. Адамуса выступіў Хенрык Лаўмяньскі, які апублікаваў у 1937 г. у «Ateneum Wileńskim» дысертацыю «Wcielenie Litwy do Polski w 1386 r.» [23]. Па яго меркаванні, выкарыстаны ў Крэўскім акце тэрмін «applicare» меў юрыдычнае значэнне раўназначнае з тэрмінам «incorporare» [23, s. 56]. Падставай для такога сцвярджэння гэтага даследчыка паслужыў аналіз дакументаў і іншых тэкстаў XIVст., у якіх ужываліся абодва гэтыя тэрміны [23, s. 44]. Таксама даследчык прывёў аргументы, якія сведчылі на карысці інкарпарацыі ВКЛ у Польшчу: распаўсюджванне кампетэнцый кароннай канцылярыі і каронная рады на ВКЛ, наяўнасць Кракаўскага пагаднення 1386 г., якое датычыла інкарпарацыі ВКЛ у Польшчу, і амажныя акты князёў Гедымінавічаў Кароне Польскай [23, s. 95–96, 102–104, 121]. Інкарпарацыя, якая была ў Крэўскім акце абавязацельствам вялікага князя літоўскага Ягайлы і яго братоў, аказалася рашэннем ў кароткатэрміновай перспектыве. Шляхам даручэння князю Вітаўту функцый вялікага князя ВКЛ

яна была заменена такой «ленніцкай формай», як т. зв. feudum oblatum, ці ахвяраваны лен [23, s. 54].

Затое з пазіцыяй Я. Адамуса пагадзіўся Хенрык Пашкевіч. Згодна з яго меркаваннем, Ягайла планаваў інкарпарацыю і такім шляхам жадаў атрымаць абарону зямель ВКЛ з усходу і ад тэўтонскіх рыцараў, дзякуючы мірнаму дагавору, які Польшча падпісала з Тэўтонскім ордэнам у 1343 г. [24, s. 254–255, 258–259]. Па яго меркаванні, тэрмін «applicare» азначаў толькі «пераход пад уладу», г. зн. што пасля выканання ўмоў заключанага дагавора ВКЛ стала ленам Польшчы. Нягледзячы на ленную залежнасць, ВКЛ як дзяржава не перастала існаваць [25, s. 15].

Такім чынам, кола пытанняў, прысвечаныя вывучэнню розных аспектаў праблематыкі Крэўскага акта, шырока адбілася ў польскай літуаністыцы XIX – 30-х гг. XX ст. Азначаная тэматыка ахвотна падымалася польскімі гісторыкамі. Аднак згаданая праблематыка, якая была прадметам разважанняў вялікай колькасці аўтараў, канчаткова не вычарпала ўсіх пытанняў і стварыла поле для даследаванняў наступных пакаленняў гісторыкаў.

Спіс крыніц і літаратуры


1. Historiae Litvanae Pars Altera seu de Rebus Lituanorum A coniunctione Magni Ducatus cum Regno Poloniae ad unionem eorum dominiorum libri octo auctore Alberto Wiiuk Kojałowicz, Societatis Iesu S. Theologiae Doctore. – Antverpiae : Apud Iacobum Mersium, MDCLXIX. – XVII, 496 p.

2. Naruszewicz, A. Historya narodu polskiego : w X t. / A. Naruszewicz. – Warszawa : Drukarnia Grölla, 1780–1786. – T. VII. Panowanie Węgrów. – 1786. – XXIV, 298, 34 s.

3. Skarbiec diplomatów papiezkich, cesarskich, krolewskich, książęcych; uchwał narodowych, postanowień różnych władz i urzędów posługujących do krytycznego wyjaśnienia dziejów Litwy, Rusi Litewskiéj i ościennych im krajów / zebrał i w treści opisał Ignacy Daniłowicz, z pozgonnych rękopismów znajdujących się w Bibljotece Muzeum Wileńskiego wydał Jan Sidorowicz : w 2 t. – Wilno : W drukarni A. H. Kirkora, 1860–1862. – T. I. – 1860. – VII, 390 s.

4. Lelewel, J. Dzieła : W X t. / J. Lelewel. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1957–1969. – T. X : Dzieje Litwy i Rusi : aż do unii z Polską w Lublinie 1569 zawartej / oprac. J. Ochmański. – 1969. – 254, [4] s.

5. Szujski, J. Dzieje Polski podług ostatnich badań spisane przez Józefa Szujskiego : w IV t. / J. Szujski. – Lwów : Nakładem Karola Wilda, 1862–1866. – T. II. Piastowie. – 1862. – XII, 294, [2] s.

6. Bobrzyński, M. Dzieje Polski w zarysie / M. Bobrzyński. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1879. – 495 s.

7. Lewicki, A. Powstanie Świdrygiełły : ustęp z dziejów unii Litwy z Koroną / A. Lewicki. – Kraków : Nakładem Akademii Umiejętności, 1892. – 389 s.

8. Lewicki, A. Nieco o unii Litwy z Koroną / A. Lewicki // Przegląd Polski. – 1893–1894. – R. 28. – T. II. – S. 235–280.

9. Balzer, O. M. Tradycja dziejowa unii polsko-litewskiej / O. M. Balzer. – Lwów-Warszawa : Nakładem księgarni Gubrynowicz i syn, 1919. – 24 s.

10. Balzer O. Unia horodelska: odczyt wygłoszony na publicznem posiedzieniu Akademii Umiejętności dnia 3 maja 1913 r. / O. Balzer. – Kraków : Nakładem Akademii Umiejętności, 1913. – 32 s.

11. Balzer, O. Stosunek Litwy do Polski / O. Balzer // Balzer, O. Pisma pośmiertne Oswalda Balzera. T. 1–3. – Lwów : Nakładem Towarzystwa Naukowego, 1934–1937. – T. 3 / [prygotowała do druku Helena Polaczkówna]. – 1937. – 379 s. – S. 243–318.

12. Kutrzeba, S. Unia Polski z Litwą / S. Kutrzeba // Polska i Litwa w dziejowym stosunku. – Kraków etc : Gebethner i Wolff, 1914. – IV, 700, [1] s. – S. 447–658.

13. Kutrzeba, S. Charakter prawny związku Litwy z Polską 1385–1569 / S. Kutrzeba // Pamiętnik VI Powszechnego Zjazdu Historyków Polskich w Wilnie 17–20 września 1935 r. / [pod red. F. Pohoreckiego i K. Tyszkowskiego]– Lwów : Nakładem Polskiego Towarzystwa Historycznego, 1935–1936. – T. I : Referaty. – 1935. – XV, 575 s. – S. 165–173.

14. Kutrzeba, S. Historja ustroju Polski w zarysie / S. Kutrzeba. – Lwów: Grafia, 1917–1921. – T. 1. Korona. – 292 s.

15. Halecki, O. Wcielenie i wznowienie państwa litewskiego przez Polskę (1386–1401) / O. Halecki // Przegląd Historyczny. – Serya II. – 1917–1918. – T. XXI. – S. 1–77.

16. Kolankowski, L. Dzieje Wielkiego księstwa Litewskiego za Jagiellonów / L. Kolankowski. – Warszawa : Scład głowny : kasa im. Mianowskiego, 1930. – T. 1 (1377–1499). – 475 s.

17. Pamiętnik VI Powszechnego Zjazdu Historyków Polskich w Wilnie 17–20 września 1935 r. / [pod red. F. Pohoreckiego i K. Tyszkowskiego]– Lwów : Nakładem Polskiego Towarzystwa Historycznego, 1935–1936. – T. I: Referaty. – 1935. – XV, 575 s.

18. Pamiętnik VI Powszechnego Zjazdu Historyków Polskich w Wilnie 17–20 września 1935 r. / [pod red. F. Pohoreckiego i K. Tyszkowskiego]– Lwów : Nakładem Polskiego Towarzystwa Historycznego, 1935–1936. – T. II: Protokoły. – 1936. – XIX, 483 s.

19. Adamus, J. O prawno-państwowym stosunku Litwy do Polski / J. Adamus // Pamiętnik VI Powszechnego Zjazdu Historyków Polskich w Wilnie 17–20 września 1935 r. / [pod red. F. Pohoreckiego i K. Tyszkowskiego]– Lwów : Nakładem Polskiego Towarzystwa Historycznego, 1935–1936. – T. I: Referaty. – 1935. – XV, 575 s. – S. 174–180.

20. Vetulani, A. Lenno pruskie od traktatu krakowskiego do śmierci księcia Albrechta 1525–1568 / A. Vetulani. – Kraków : s. n., 1930. – 318 s.

21. Adamus, J. Państwo litewskie w latach 1386–1398 / J. Adamus // Księga pamiątkowa ku uczczeniu 400. Rocznicy wydania I Statutu Litewskiego// Rozprawy Towarzystwa przyjaciół nauk w Wilnie. – Wilno : Nakładem Towarzystwa Przyjaciół Nauk, 1935. – T. 8. – S. 15–79.

22. Adamus, J. Najnowsza literatura o akcie krewskim / J. Adamus // Wiadomości Studium Historii Prawa Litewskiego Uniwersytetu Stefana Batorego. – Wilno, 1938. – T. 1. – S. 273–316.

23. Łowmiański, H. Wcielenie Litwy do Polski w 1386 r. / H. Łowmiański // Ateneum Wileński. – 1937. – R. XII. – S. 36–145.

24. Paszkiewicz, H. O genezie i wartości Krewa / H. Paszkiewicz. – Warszawa : Gebeithner i Wolff, 1938. – 356 s.

25. Paszkiewicz, H. W sprawie inkorporacji Litwy do Polski w 80. latach XIV w. Z powodu pracy H. Łowmiańskiego «Wcielenie Litwy do Polski w 1386 r.» / H. Paszkiewicz. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1938. – 48 s.